


# Хаім Суцін

**У Парыжы ў 1913 годзе з’явіўся яшчэ адзін наш зямляк, які прыехаў сюды ўжо мастаком: Хаім Суцін, родам з Смілавічаў, што каля Мінску.**

У год нараджэння Хаіма Суціна, 1893-ім, тут жылі каля 3500 жыхароў, працавалі дзве земскія народныя вучэльні, дзве царкоўна-прыхадскія школы, мячэць, пяць габрэйскіх малітоўных дамоў, царква, касцёл Святога Вінцэнта і кляштар місіянераў.

На вачах Хаіма ў Смілавічах будавалі новы палац Манюшкаў побач са старым. Славуты смілавіцкі палац быў поўны скарбаў: карцінная галерэя, музей з каралеўскаю зброяй, бібліятэка з архівам. Гэтыя цуды збіраліся тры стагоддзі Сапегамі, Завішамі, Агінскімі, Манюшкамі – былымі ўладальнікамі мястэчка. Палацы стаялі ў вялікім парку на беразе ракі. Мастак часта згадваў малую радзіму і дзяцінства.

Марыя Вараб’ёва-Стэбельская, знакамітая Марэўна, у сваіх мемуарах “Маё жыццё з мастакамі “Вулля”, піша:
“Ведаеш, Марэўна”, – сказаў мне Суцін у часе нашай апошняй сустрэчы ў Парыжы, – мне і сёння па-ранейшаму тужліва думаць пра тое, як маці адмаўляла сабе ўва ўсім дзеля мяне. Пракарміць адзінаццаць дзяцей! Нават больш – дванаццаць: мой бацька быў як дзіця. Заўсёды галодны. Ён часам адбіраў у мяне крыхі ежы проста з талеркі. Як маці было бачыць усё гэта? І яна, няшчасная, аддавала мне апошняе. Я ўпэўнены, што яна памерла ад ліхіх прыгодаў!.." І яшчэ тамсама: “Суцін любіў расказваць пра дзяцінства і юнацтва, аб працы і пра свае надзеі, пра мастакоў ды іншых людзей. Я адчувала ў ім адзіноцтва аблуднай душы...” (цытуецца паводле: Маревна (Воробьева-Стебельская М. Б.). Моя жизнь с художниками “Улья”. М. Искусство-XXI век, 2004).

Габрэйская сям’я Суцінаў належала да найбяднейшае часткі смілавіцкага кагалу. Ён рана пакінуў родную хату і з’ехаў вучыцца ў сталіцу Беларусі. Тут пэўны час працаваў рэтушорам у фотаатэлье. У Мінску браў прыватныя

лекцыі ў школе малявання Янкеля Кругера. Гэтак у 1907 годзе распачалася ягоная мастацкая адукацыя. Менавіта ў Беларусі ён атрымаў адукацыю і тут пачаў практыкаваць як мастак. Пра тое, які характар мела тое навучанне, можна меркаваць з успамінаў Суціна, які пісаў: “Калі трэба было намаляваць вугалем нейкага Апалона, Венеру ці Мінерву – якую я атрымліваў асалоду! Я маляваў для іх багоў! Але ўсе яны былі падобныя да старых з мястэчка Смілавічы!” (цытуецца паводле: Васильева Ж. Счасливчик Сутин. Лехаим. 2010; с. 43–44).

Пасля гадоў мастацкае навукі ў сталіцы Беларусі Хаім Суцін працягнуў сваё навучанне ў Вільні. А ў 1913-м мастак назаўсёды пакідае Радзіму. Такім чынам, да свайго прыезду ў Францыю Суіцн жыў і вучыўся толькі ў Беларусі.
Да смерці мастак жыў у Парыжы (за выняткам 1919–1922 гадоў, якія правёў ва ўсходніх Пірэнэях), быў блізкім сябрам свайго земляка Марка Шагала і Амэдэа Мадыльяні. Творам, напісаным пераважна паміж 1920–1929 гадамі, уласцівыя глыбока індывідуальныя бачанне свету і тэхніка. Часта перарабляў ці знішчаў свае раннія працы і амаль нічога не маляваў пасля 1930-га. Хаім Суцін быў у Парыжы падчас Другой сусветнай вайны, памёр тамсама ў 1943-м. Большая частка твораў была створаная ў Францыі. Там атрымаў і прызнанне публікі. Таму цалкам справядліва называць яго французскім і беларускім мастаком.

У Беларусі свайго земляка вельмі шануюць. Хаім Суцін нарадзіўся ў Беларусі, краіне, дзе жылі пакаленні ягоных продкаў, любіў гэты край і часта згадваў пра яго, тут ён атрымаў сваю першую мастацкую адукацыю і пакінуў Беларусь ужо ў свядомым дарослым веку. Творчасці і біяграфіі Суціна прысвечаныя шматлікія публікацыі ў навуковых ды папулярных выданнях. Да нядаўняга часу тут жылі і ягоныя сваякі. У ягоных родных Смілавічах, дзе ён нарадзіўся і дзе пахаваныя ягоныя бацькі, у 2008 годзе пры спрыянні створаная музейная экспазіцыя “Прастора Хаіма Суціна”, што дзеіць у будынку мясцовага дому дзіцячай творчасці. Тры карціны мастака – партрэт “Ева” (1928), пейзаж “Вялікія лугі ў Шартры, каля віядуку” (каля 1934) і “Якая заснула з кнігай. Мадлен Кастэн” (1937) – застаюцца ў карпаратыўнай калекцыі “Белгазпрамбанку. Гэтыя працы ўлучаныя ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.